# "Славянскі базар", тэатр эстрады, "Беларусьфільм"...



Візіт у Маладзёжны тэатр эстрады

...І гэта далёка не ўвесь спектр пытанняў, разгледжаных на гэтым насычаным падзеямі тыдні, у якіх прыняў удзел Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Анатолій Маркевіч.

Так, 27 верасня адбылося паседжанне рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта пад кіраўніцтвам Намесніка Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Ігара Петрышэнкі, дзе былі абмеркаваны вынікі правядзення XXXI Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску" і падыходы да яго правядзення ў 2023 годзе.

Міністр культуры Анатолій Маркевіч адзначыў паспяховую рэалізацыю праграмы мерапрыемстваў фестывалю, запатрабаванасць фестывальных праектаў у гледачоў. "Славянскі базар" паранейшаму з'яўляецца візітнай карткай Беларусі ў свеце мастацтва.

Але было адзначана, што ёсць куды развівацца далей. Пастаўлены задачы па абнаўленні праграмы і фармату правядзення асноўных мерапрыемстваў, насычэнні фестывальнай палітры новымі праектамі, у тым ліку для маладзевай аўдыторыі, з асваеннем новых пляцовак для іх правядзення. Будзе наладжана больш шчыльнае супрацоўніцтва з расійскім бокам па рэалізацыі праектаў Саюзнай дзяржавы.

Так што чарговы музычны форум мастацтваў у Віцебску ў 2023 годзе абяцае зазіхацець новымі фарбамі з прыемнымі сюрпрызамі.

28 верасня Ігар Петрышэнка і Анатолій Маркевіч разам наведалі Маладзёжны тэатр эстрады.

Развіццё тэатра эстрады, папулярызацыі яго дзейнасці — вось асноўныя тэмы дыялогу з кіраўніцтвам тэатрально-відовішчнай установы. Былі закрануты пытанні ўдасканалення і ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы, арганізацыі выступленняў артыстаў на тэрыторыі краіны і за яе межамі.

Таксама 28 верасня Міністр культуры пабываў на Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм", дзе разам з Генпракурорам Беларусі **Андрэем Шведам** і гендырэктарам кінастудыі **Уладзімірам Карачэўскім** абмеркаваў вытворчасць кінафільмаў. У тым ліку размова ішла аб рабоце над нацыянальным праектам пад рабочай назвай "Мы адзіныя". Анатолій Мечыслававіч і Андрэй Іванавіч азнаёміліся з работай цэхаў кінастудыі.

У сумесных планах Генпракуратуры і кінастудыі — супрацоўніцтва ў галіне асвятлення тэм генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і жыцця суайчыннікаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі пасля заключэння Рыжскага мірнага дагавора.

Была падкрэслена значнасць захавання гістарычнай памяці і недапушчэнне скажэння гісторыі.

29 верасня Анатолій Маркевіч прыняў удзел у анлайн-сустрэчы, арганізаванай пасольствам КНР у Рэспубліцы Беларусь з нагоды 73-годдзя Кітайскай Народнай Рэспублікі.

— Апошнія гады развіццё беларуска-кітайскіх адносін актывізавалася ва ўсіх сферах. Нягледзячы на геаграфічную аддегласць, дзяржавы пастаянна знаходзяць новыя магчымасці ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, — адзначыў Анатолій Мечыслававіч.

Сярод напрамкаў дзейнасці ў галіне гуманітарнага супрацоўніцтва трэба адзначыць работу камісіі па культурным супрацоўніцтве беларуска-кітайскага міжурадавага камітэта, абменныя Дні культуры паміж Рэспублікай Беларусь і Кітайскай Народнай Рэспублікай, якія праходзяць з 2011 года.

— Усё гэта з'яўляецца ўкладам у пашырэнне і ўмацаванне дружбы паміж нашымі народамі, — рэзюмаваў міністр. — Толькі сумеснымі намаганнямі мы зможам практычна рэалізаваць ідэі збліжэння народаў і ўмацавання супрацоўніцтва!




Пасяджэнне рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта